Чацвёрты квартал 2024 года адзначыўся мноствам падзей. У гэты перыяд бібліятэкі раёна адзначылі юбілейныя і знамянальныя даты каляндара. Шмат увагі ўдзялялася рабоце па выхаванню здаровага ладу жыцця, праводзіліся мерапрыемствы ў рамках экалагічнага, ідэалагічнага, прававога, сямейнага выхавання.

## Тыдзень сямейнага чытання

У Беларусі штогод **14 кастрычніка** адзначаецца Дзень маці. Гэты дзень – выдатная магчымасць выказаць сваю любоў і падзяку самаму галоўнаму ў нашым жыцці чалавеку – маці.

**11 кастрычніка**, напярэдадні свята Дня маці, супрацоўнікі аддзела маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы правялі літаратурна-гульнявую праграму «Мая мама – сонейка, я яе сланечнік» у філіяле “Ражанкаўская інтэграваная бібліятэка”. Удзельнікі мерапрыемства атрымлівалі асалоду ад чытання вершаў пра мам, а таксама прымалі ўдзел у розных гульнях і конкурсах, прысвечаных гэтаму выдатнаму святу. Дзеці з энтузіязмам распавядалі пра сваіх мам, дзяліліся гісторыямі і стваралі вырабы, якія потым падорацць сваім каханым бацькам.

**13 кастрычника** філіял “Бакштаўская сельская бібліятэка”, правяла конкурс вершаў “Святое слова – мама". У гэты дзень дзеці не толькі чыталі вершы пра маму, але з натхненнем распавядалі пра сваіх дарагіх матуль, якія яны прыгожыя, разумныя і добрыя.

**13 кастрычніка** ў філіяле “Навадворская сельская бібліятэка” адбыўся літаратурна-музычны мікс "Ласкава цябе абдыму". Чытачы пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення свята, з творчасцю пісьменнікаў і паэтаў, чые творы прысвечаны мамам. Прысутныя ўдзельнічалі ў вясёлых конкурсах і жартоўных віктарынах.

**13 кастрычніка** напярэдадні Дня маці ў філіяле “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Бяседа” на тэму “Цяпло мацярынскага сэрца". Была падрыхтавана забаўляльная праграма, у якую ўвайшлі конкурсы, віктарыны, загадкі і прыказкі. Бібліятэкары павіншавалі жанчын з надыходзячым святам, уручыўшы кветкі і паштоўкі. Да мерапрыемства была аформлена выстава "Мілы вобраз маці".



У сямейную гасціную “Зазірні ў матуліны вочы” філіял “Ракавіцкая сельская бібліятэка”, запрасіў сваіх чытачоў напярэдадні Дня маці **13 кастрычніка.** Дзеці агучылі самыя далікатныя, ласкавыя словы пра сваіх матуль.

**20 кастрычніка** ў філіяле “Навадворская сельская бібліятэка” адбылася літаратурная гадзіна "Пра тату з любоўю", прысвечаная Дню бацькі. Таты ўспаміналі смешныя гісторыі са свайго дзяцінства. Дзеці павіншавалі сваіх тат са святам.

**21 кастрычніка** філіял “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” правяла гульнявую праграму “Бацька – сем'і апора". У гэты дзень дзеці не толькі чыталі вершы пра тату, але з натхненнем распавядалі пра сваіх татах, пра іх захапленні, якія яны клапатлівыя, мудрыя і добрыя.



**26 кастрычніка** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава”,

адбылося пасяджэнне жаночага клуба “Берагіня” на тэму “Аб той, хто дорыць нам жыццё і цяпло” прысвечанае Дню маці.

## Дэкада прававых ведаў “Правы дзіцяці-правы чалавека”

Да сусветнага дня дзіцяці ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” прайшла прававая гульня «Мае правы, мае абавязкі». Удзельнікі вызначалі розніцу паміж правамі і абавязкамі, вырашалі, хто мае рацыю і хто вінаваты ў спрэчцы, казалі пра тое, што трэба паважаць правы іншых людзей, разважалі пра «Мянушкі» ў класе, задавалі шмат пытанняў бібліятэкару па тэме.

Філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” правяла прававы навігатар «Усе мы ў праве ведаць аб праве». З дапамогай інтэрактыўнай гульні навучэнцы папаўнялі веды цікавымі звесткамі, праяўлялі ініцыятыву пры выкананні заданняў.

Інтэрактыўная размова адбылася у філіяле “Ражанкаўская інтэграваная бібліятэка” на тэму “Голас дзяцей: правы і магчымасці". У ходзе мерапрыемства дзеці прынялі ўдзел у інтэрактыўных гульнях, віктарынах і абмеркаваннях якія дапамаглі ім лепш зразумець, што азначае мець права.

У філіяле “Бакштаўская сельская бібліятэка” прайшла гадзіна прававых ведаў “Маю права". Юныя чытачы, удзельнікі мерапрыемства, пазнаёміліся з асноўнымі правамі дзяцей, падчас падарожжа па казцы “Прыгоды Бураціна", абмеркавалі якія правы герояў парушаныя. Далей дзеці ў гульнявой форме адказвалі на пытанні бібліятэкара, адгадвалі загадкі па прававой тэматыцы, пазнаёміліся з кнігамі дадзенай накіраванасці.

## Работа з людзьмі пажылога ўзросту

**1 кастрычніка** цёплымі віншаваннямі сустракала Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі сваіх чытачоў старэйшага пакалення. Усе жадаючыя мелі магчымасць стаць удзельнікамі літаратурных сустрэч "Калі прыходзіць час". Падборка кніг, якімі захапляліся і даражылі, якія чыталіся і перачытваліся не толькі ў юнацтве, запрасіла прысутных вярнуцца ў светлы і выдатны час.

Да Міжнароднага Дня пажылых людзей бібліятэкар філіяла "Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава" разам з юнымі чытачамі арганізавала віншавальную паштоўку "Букет з самых далікатных пачуццяў". У ходзе мерапрыемства дзеці сваімі рукамі падрыхтавалі памятныя сувеніры, паштоўкі і разам з бібліятэкарам павіншавалі пажылых чытачоў бібліятэкі са святам урачыстымі вершамі і ўручылі падарункі.



**2 кастрычніка** філіял "Навадворская сельская бібліятэка" правяла "Святочныя сустрэчы для тых, чыю восень не пакінула вясна». Насычаная праграма ўключала музычныя выступленні, чытанне вершаў і цікавыя конкурсы, якія выклікалі ўсмешкі і радасць ва ўсіх прысутных. На мерапрыемстве бібліятэкар павіншавала пажылых людзей са святам, адзначыўшы іх уклад у развіццё грамадства і важнасць іх жыццёвага вопыту. Кожны ўдзельнік атрымаў памятныя падарункі.

## Краязнаўства

**24 кастрычніка** ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” прайшло падарожжа ў гісторыю «Гродзенская дыяцэзія на шляхах гісторыі», прымеркаванае да 125-годдзя з дня стварэння Гродзенскай дыяцэзіі, з іерархіяй духавенства, з роляй святароў у жыцці чалавека. Праводзіў шмат цікавых прыкладаў, адказваў на пытанні ребят.



**29 кастрычніка** ў філіяле “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” прайшоў пазнавальны ўрок “Царква-крэпасць на Шчучынскай зямле” (да 500-годдзя царквы Нараджэння Прасвятой Багародзіцы). Шчучынская зямля багатая скарбамі і адно з іх царква-крэпасць. Удзельнікам мерапрыемства быў прадстаўлены відэафільм, з якога школьнікі даведаліся шмат цікавага для сябе. Дзецям было прапанавана сабраць пазл з выявай царквы, а таксама адказаць на пытанні тэматычнай віктарыны.

## *Мерапрыемствы, прысвечаныя 85-годдзю ўтварэння Шчучынскага раёна*



**12 снежня** прайшло мерапрыемства ў філіяле “Васілішкаўская сельская бібліятэка” на тэму “Шчучынскі край – часцінка Беларусі", удзельнікі даведаліся шмат цікавага з летапісу вёскі “Васілішкі". Завяршылася сустрэча знаёмствам з кніжнай выставай «Люблю мой край, старонку гэту», дзе было

прапанавана азнаёміцца з выданнямі аб Шчучынскім раёне.

У Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні «Ад усёй душы» на тэму «Мой край запаветны». Упрыгожваннем мерапрыемства стаў летапіс "Шчучынскага раёна", які быў спецыяльна падрыхтаваны да юбілейнай даты. Яна адкрыла цікавыя і важныя старонкі з жыцця горада і раёна. Аповяд ішоў аб сацыяльна-культурна-эканамічным жыцці рэгіёну. А фатаграфіі дапамагалі лепш прадставіць працоўныя будні, культурны вольны час, настрой людзей тых гадоў.

У філіяле "Ракавіцкая сельская бібліятэка" прайшоў краязнаўчы круіз "Чым і кім слаўны Шчучынскі раён". Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з вядомымі людзьмі раёна, сельскагаспадарчымі арганізацыямі, якія ўносяць свой уклад у развіццё раёна. З цікавасцю прайшоў прагляд фільма "Славутасці Шчучына", таксама чытачы пазнаёміліся з тэматычнай выставай "Шчучын: мінулае і сучаснасць".

## Здаровы лад жыцця

У філіале "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" для навучэнцаў ДУА «Дэмброўская сярэдняя школа», прайшоў відэалекторый «Курэнне – небяспечнае захапленне», прысвечаны Сусветнаму дню без тытуню. У ходзе мерапрыемства ўдзельнікі даведаліся пра шкоду курэння, яго наступствы для здароўя і ўплыў нікаціну на арганізм.

Філіял "Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка" запрасіў навучэнцаў на інфармацыйнае дасье "За воблакам тытунёвага дыму". Школьнікам была паказана мультымедыйная прэзентацыя "Курыць-здароўю

шкодзіць!”. У завяршэнні ўдзельнікі атрымалі памяткі з рэкамендацыямі па адмове ад курэння.

Філіял “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” **21 лістапада** запрашала на скрыжаванне меркаванняў



“Курэнне і вэйп на адных вагах”. Дзецям быў прадстаўлены да прагляду відэаролік пра шкоду курэння і вэйпаў, дадзеная інфармацыя аб наступствах гэтых шкодных звычак, а пазней дзеці выказалі сваё меркаванне аб пачутым. У канцы з дапамогай гульні «карысна-шкодна» атрыманыя веды былі замацаваны.

## Святы пажаданняў і надзей

У філіяле “Інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава” прайшло пасяджэнне жаночага клуба “Берагіня” на тэму “Стравы да навагодняга стала". Бібліятэкар правяла кулінарнае падарожжа, распавёўшы аб навагодніх традыцыях розных краін. Дружна адгадаўшы загадкі, удзельніцы мерапрыемства прэзентавалі рэцэпты сваіх навагодніх страў, бо ў кожнай сям'і на гэты конт сваё меркаванне і свой смак “ Новага года. У завяршэнне сустрэчы з вялікім задавальненнем наведалі навагоднюю фотазону і сфатаграфаваліся на памяць.

**26 снежня** ў філіяле “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” прайшлі мерапрыемствы: навагодні карагод “У чаканні цудаў", літаратурна-творчая лабараторыя "Навагодні нон-стоп". Выхаванцы зімовага школьнага лагера “ДУА Сярэдняя школа №2 імя В.Я. Пярвушына”, якія сталі ўдзельнікамі мерапрыемства з задавальненнем адгадвалі загадкі, выконвалі творчыя заданні. Дзецям быў прапанаваны прагляд навагодніх кароткіх фільмаў, што дапамагло стварэнню святочнага настрою.



У філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” была праведзена гульнявая інфарміна “Як нашы продкі святкавалі Новы год". Дзеці, якія адпачываюць у лагеры, пачулі аповяд пра вераванні нашых продкаў, днях, калі адзначалі не Новы год, а Навалецце, аб сакральным значэнні лічбы 12 для славян, аб ігрышчах і варожбах, аб калядаўшчыках. Шмат цікавага бібліятэкары распавялі пра традыцыі прыбіраць ёлачку, пра павер'і, звязаныя з гэтым дрэвам. Даведаліся яны хто такі Каляда, Ярыла, Зюзя і аб звязаных з імі легендах. Пазнаёміліся з кнігамі, дзе пра іх можна прачытаць падрабязней. Зацікавіла рабят і гісторыя з'яўлення снегавіка. Усе разам успаміналі навагоднія мультфільмы.

## Сусветны Дзень барацьбы са СНІДам

**4 снежня** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава” прайшла гадзіна пытанняў і адказаў "Няхай заўсёды будзе заўтра", прымеркаваная да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам. Удзельнікі даведаліся аб шляхах

заражэння ВІЧ і мерах прафілактыкі. Школьнікі паглядзелі відэаролікі “Простыя правілы супраць СНІДу” і уплыў спайсу на арганізм", а таксама паразважалі аб бяспечных паводзінах.



**5 снежня** ў філіяле “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” прайшоў інфармацыйны дайджэст “СНІД/ВІЧ - спыніся за крок ад бяды”, да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам.

Дзеці пазнаёміліся з правіламі прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і пра тое, як важна ў жыцці прыхільнасць здароваму ладу жыцця. У гульнявой форме замацавалі веды аб тым, як і пры якіх абставінах можна заразіцца СНІДам, распавялі пра знакамітасцяў, якія не здолелі зберагчы сябе ад страшнай хваробы.

## Сусветны Дзень інвалідаў



Філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка”, правяла гадзіну міласэрнасці пад назвай “Моцныя духам”, прымеркаваны да Дня інвалідаў. Бібліятэкары наведалі актыўных чытачоў з абмежаванымі магчымасцямі, якія знаходзяцца ў Жалудоцкай гарпасялковай бальніцы. Падчас сустрэчы яны шчыра пажадалі здароўя, даўгалецця, аптымізму і добрага настрою. Акрамя таго, бібліятэкары пазнаёмілі чытачоў з навінкамі літаратуры і перыядычных выданняў, уручылі невялікія падарункі, напоўніўшы атмасферу цяплом і клопатам.

**3 снежня** ў філіале “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава”, прайшла гадзіна разважанняў “Гісторыі моцных духам ". Удзельнікі пачулі гісторыі тых, для каго фізічныя абмежаванні не сталі перашкодай для выканання мары:смелай і мэтанакіраванай Джэсікі Кокс, пісьменніка і грамадскага дзеяча Ніка Вуйчыча, мастака, які малюе ротам – Анатоля Галушку, ураджэнца Івацэвіцкага раёна, бізнэсмена Аляксея Талая. Паглядзелі мультфільм пра дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі "Пра Дзіму".

## Літаратурныя юбілеі

прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка Міхася Лынькова.

**28 лістапада** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аг. Дэмбрава”, для навучэнцаў групы падоўжанага дня адбыўся медыя-агляд “Прамяні таленту", прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка Міхася Лынькова. Падчас мерапрыемства дзеці пазнаёміліся з жыццём і творчасцю аўтара, яго значэннем у беларускай літаратуры. Бібліятэкар падрыхтавала займальныя прэзентацыі і відэаматэрыялы, якія дапамаглі стварыць атмасферу акунання ў свет творчасці Лынькова.



Да 125-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка Міхася Лынькова філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка”, запрасіла дзяцей на літаратурнае знаёмства «Жыццё вялікае і шчодрае». Бібліятэкар расказала пра трагічны лёс яго жонкі і сына, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

## Мерапрыемствы прысвечаныя 60-годдзю беларускай паэткі Святланы Іосіфаўны Абдулаевай

**10 лістапада** ў філіяле “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка” прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання “Бяседа” на тэму “Музыка дажджу”, прысвечанае 60-годдзю беларускай паэткі Святланы Іосіфаўны Абдулаевай. З-пад яе пяра выйшлі вершы і песні. Дзякуючы дзіўнай шчырасці, гэтыя творы, пачутыя аднойчы, назаўсёды пакараюць. Творчая сустрэча прайшла ў цёплай, сяброўскай атмасферы і падарыла шмат светлых эмоцый. Кожнаму ўдзельніку, пісьменніца падарыла свой зборнік вершаў "Напярэдадні кахання".



## Літаратурная старонка

**18 кастрычніка** ў рамках фестывалю “Жыла-была казка” у г.Масты, Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі сумесна з філіялам “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” запрашалі наведаць казачны куток “Чароўны свет





кніг". Для самых маленькіх жыхароў і гасцей горада была падрыхтавана інтэрактыўная дзіцячая пляцоўка: зона для чытання; творчая майстэрня, дзе дзеці маглі маляваць і ствараць вырабы на розныя тэмы з выкарыстаннем розных мастацкіх матэрыялаў, гульнявая зона з настольнымі і рухомымі гульнямі. Быў праведзены майстар-клас “Казкі ажываюць у нашых руках”. Самых дапытлівых чакалі адкрытыя інтэрактыўныя стэнды з навучалымі гульнямі і віктарынамі: “Адгадай казку па апісанні”, “Веданне казачных герояў і падзей” і інш.

**30 кастрычніка** ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” прайшла літаратурная гульня "Па старонках любімых кніг”. Мерапрыемства складалася з некалькіх займальных частак: "Размінка", “Казачныя загадкі", “Чорная скрыня".

У філіяле “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” **31 кастрычніка** для дзяцей была арганізавана літаратурна-гульнявая майстэрня "Чытаем і ствараем". Удзельнікамі мерапрыемства сталі выхаванцы школьнага лагера ДУА “Сярэдняя школа №2 г.Шчучына імя У. Я. Пярвушына”, якія з задавальненнем шукалі казачныя прадметы ў бібліятэцы, адгадвалі творы , у якіх можна знайсці іх. З літар дзеці збіралі імёны казачных герояў, прыдумвалі казачныя гісторыі.

**15 лістапада** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні “Ад усёй душы” “День НеПрочитанных книг. Тысячи классных страниц”. Прагучалі вершы Б.Слуцкага і В.Тушновай пра чытачоў і кнігі. Асноўны час мерапрыемства быў нададзены прэзентацыі кнігі "Гісторыя, расказаная народам"

## Выбары прызідэнта Рэспублікі Беларусь

**13 снежня** ў філіяле “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” адбылося мерапрыемства пад назвай “Сёння вучань – заўтра выбаршчык”, прысвечанае выбарачнай кампаніі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Удзельнікі даведаліся аб правілах галасавання і выбарчым праве Рэспублікі Беларусь, а таксама аб яго адрозненнях ад заканадаўства іншых краін. У ходзе мерапрыемства дзеці пагрузіліся ў гісторыю заканадаўства і замацавалі атрыманыя веды, удзельнічаючы ў цікавай віктарыне. Акрамя таго, яны азнаёміліся з літаратурай прававой тэматыкі.



Філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка”, правяла актуальную размову «Ваш голас на карысць краіны». Бібліятэкар расказала, чаму важна ўдзельнічаць у выбарах, што такое выбарчае права, як і для чаго праводзяцца выбары прэзідэнта ў нашай краіне, хто і якім чынам можа ў іх удзельнічаць. Разам з навучэнцамі вырашалі практычныя сітуацыі і адказвалі на пытанні віктарыны "Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь". Напрыканцы мерапрыемства адбыўся агляд-знаёмства з прававой інфармацыйнай выставай "Наш выбар – наша будучыня".

**18 снежня** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі прайшла дыялогавая пляцоўка “Будучыню ствараем мы: выбары - 2025", прысвечаная маючым адбыцца выбарам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Мерапрыемства сабрала навучэнцаў 10 класа ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Шчучына", якія імкнуцца глыбей зразумець значнасць выбараў і сваю ролю ў палітычным жыцці краіны.

Напярэдадні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, **19 снежня** ў філіяле “Васілішкаўская сельская бібліятэка” прайшло мерапрыемства «Зрабіць выбар: ваш абавязак і ваша права». За круглым сталом абмяркоўваліся важныя аспекты.

**26 снежня** філіал “Ракавіцкая сельская бібліятэка”, запрасіла чытачоў на актуальны дыялог “Мы будучыя выбаршчыкі", прысвечаны выбарам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У даступнай форме абмеркавалі правы і абавязкі грамадзян, а таксама даведаліся, як і для чаго праводзяцца выбары ў нашай краіне, і хто можа ўдзельнічаць у іх. Таксама ўдзельнікі змаглі азнаёміцца з кніжнай выставай "Наш выбар – наша будучыня", дзе прадстаўлены ключавыя дакументы: Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і Выбарчы кодэкс, а таксама новыя кнігі для дзяцей пра выбары: "Дзецям пра Канстытуцыю: проста пра галоўнае" і "Дзецям пра выбары: проста пра галоўнае".

## Фарміраванне інфармацыйнай культуры

Урокі інфармацыйнай культуры ў бібліятэчных установах – работа, якая ставіць сваёй мэтай выхаванне інфармацыйнай культуры сярод навучэнцаў, фарміраванне навыкаў працы з інфармацыяй і дапамогу ва ўжыванні гэтых уменняў на практыцы.

**17 кастрычніка** філіял “Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка”, наведала аддзел культуры і вольнага часу «Жалудоцкі дом культуры» і ДУА «Жалудоцкая Дзіцячая школа мастацтваў» з выязным днём інфармацыі: «Сцежкамі роднага краю». Увазе работнікаў былі прадстаўлены навінкі



літаратуры аб краі і вобласці, а таксама сацыяльна значныя выданні.
**24 кастрычніка** работнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі ў чарговы раз наведалі прадпрыемства Шчучынскі філіял ААТ "Малочны Свет" з выязным днём інфармацыі «Чалавек, які чытае – чалавек паспяховы». Для работнікаў завода праведзены агляд навінак літаратуры з фонду бібліятэкі.

## Павышэнне прафесійнага майстэрства

**2 снежня** на базе Шчучынскай раённай бібліятэкі прайшла рабочая сустрэча з супрацоўнікамі бібліятэк раёна "Планаванне дзейнасці бібліятэк на 2025 год". У ходзе абмеркавання ўдзельнікі разгледзелі ключавыя напрамкі работы бібліятэк на наступны год. У цэнтры ўвагі апынуліся наступныя пытанні: асноўныя напрамкі дзейнасці; планаванне работы ў рамках конкурсаў і акцый; асноўныя мерапрыемствы і формы работы з карыстальнікамі; арганізацыя работы з кніжным фондам; планаванне даведачна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай працы.



У снежні Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі для супрацоўнікаў бібліятэк раёна праведзены



бібліяпрактыкум «Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат». Разглядаліся пытанні па вядзенні краязнаўчай картатэкі, фондзе даведачных і бібліяграфічных выданняў краязнаўчага зместу, архіве выкананых бібліяграфічных даведак. З навінкамі краязнаўчай літаратуры пазнаёміла прысутных загадчык аддзела фарміравання бібліятэчнага фонду Макара Т.Ч.

Бібліятэкар аддзела
маркетынгу, сацыякультурнай
дзейнасці і метадычнай работы А.С. Бачко